***Жураў М. С.***

# КУЛЬТ АСОБЫ Ў НАЙНОЎШЫ ЧАС: ПРЫЧЫНЫ І ПРАЯВЫ

*Жураў Мікіта Сяргеевіч, студэнт 1 курса юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, г. Мінск, Беларусь, mikitazhurau@gmail.com*

*Навуковы кіраўнік: выкладчык Бічун В. М.*

У навуковай літаратуры існуе шмат азначэнняў тэрміну “культ асобы”. Найбольш поўна, на наш погляд, гэта паняцце можна вызначыць як узвялічванне ролі аднаго чалавека, прыпісванне яму вызначальнага ўплыву на ход гістарычных падзей, якое яўна або ўскосна працінае сферы жыцця грамадства.

Гісторыя дэманструе, што культ асобы не можа сфармавацца ў дэмакратычных краінах. Асоба кіраўніка дзяржавы, як правіла, набывае асаблівы статус у таталітарных рэжымах, дзе ажыццяўляецца падаўленне “няправільных” думак і меркаванняў. Першыя праявы гэтай з’явы можна было назіраць у старажытныя часы: культ фараона ў Егіпце меў рэлігійныя рысы. Феномен культу асобы быў уласцівы ў тым ліку і абсалютным манархіям. З чым было звязана масавае ўзнікненне культаў асобы ў найноўшы час? Кастрычніцкая рэвалюцыя кардынальна змяніла ход падзей у свеце. Таталітарны рэжым, які існаваў спачатку ў РСФСР, а пазней распаўсюдзіўся і на новастворыаныя савецкія рэспублікі, зрабіў магчымым з’яўленне культаў асобы У. Леніна, І. Сталіна і іншых “правадыроў”. Пасля Другой сусветнай вайны, калі быў створаны сацыялістычны лагер і адбывалася распаўсюджанне савецкай мадэлі дзяржавы, у краінах Усходняй Еўропы і Азіі ішло стварэнне і замацаванне маштабных культаў асобы, такіх як культы асобы Маа Цзэдуна, Нікалае Чаўшэску, Энвера Ходжы, Кім Ір Сэна, Іосіпа Броз Ціта.

Трэба адзначыць, што гэта з’ява была характэрнай не толькі для краін г. зв. “народнай дэмакратыі”. У нацысцкай Германіі і фашысцкай Італіі, якія можна ахарактарызаваць як таталітарныя дзяржавы, таксама існавалі культы асобы. Культ фюрэра прысутнічаў у паўсядзённым жыцці немцаў, калі яны віталіся як у фармальных, так і нефармальных зносінах з дапамогай выразу “Heil Hitler!” (“Няхай жыве Гітлер!”).

Асаблівую ўвагу выклікаюць культы асобы дыктатараў краін Афрыкі. Пасля абвяшчэння незалежнасці былых калоній на сваіх пасадах замацаваліся адыёзныя “ўладары”, якія сваімі крокамі назаўсёды засталіся ў гісторыі. Так, Прэзідэнт Цэнтральна-Афрыканскай Рэспублікі Ж.-Б. Бакаса ў 1976 г. абвясціў ЦАР манархіяй, а сам стаў імператарам. Каранацыя каштавала бюджэту беднай афрыканскай дзяржавы ў чвэрць экспартнага даходу за год. Зыходзячы з гэтага, можна вылучыць яшчэ адну прычыну з’яўлення культаў асобы: нізкі ўзровень свядомасці насельніцтва.

Адзначым, што перадумовы культу асобы нярэдка зыходзілі ад саміх дыктатараў. Пасля візіту ў сацыялістычныя краіны Азіі (у прыватнасці, у Кітай і

КНДР) Генеральны сакратар ЦК Румынскай кампартыі Чаўшэску пад уплывам убачанага ў гэтых краінах у ліпені 1971 г. выступае з “Ліпеньскімі тэзісамі”, ажыццяўленне якіх паступова прыводзіць да з’яўлення культу. Некаторыя даследчыкі, а таксама паплечнікі румынскага дыктатара адзначаюць, што візіты Чаўшэску ў КНР і КНДР паспрыялі ўсталяванню культу асобы. Узвялічванне дыктатара адбывалася па аналагічных з Кітаем і Паўночнай Карэяй кроках: калі Маа Цзэдун меў тытул “чырвонага сонца”, Кім Ір Сэн – “вялікага правадыра”, то Нікалае Чаўшэску называўся дзяржаўнай прапагандай “бравым сынам народа”, “дарагім і любімым кіраўніком”, “геніем Карпат”.

Энвер Ходжа, кіраўнік Народнай Сацыялістычнай Рэспублікі Албанія (1946–1985), не падтрымаў развенчванне культу асобы Сталіна ў Савецкім Саюзе. Пасля XX з’езда КПСС у Албаніі адбываецца III з’езд Албанскай партыі працы, на якім адбываліся спробы рашуча раскрытыкаваць постаць Ходжы, як гэта было зроблена М. Хрушчовым у дачыненні да “правадыра народаў”. У адказ на гэта некаторыя дэлегаты былі знявечаны або расстраляны, а культ асобы албанскага дыктатара працягваў імкліва замацоўвацца.

Неабходна заўважыць, што культ асобы як з’ява не знікла і ў сучасным свеце. Самым вядомым прыкладам выступае КНДР, дзе існуе своеасаблівая трыяда “вялікіх правадыроў” – Кім Ір Сэна, Кім Чэн Ыра і Кім Чэн Ына. У адрозненне ад першых двух, культ Кім Чэн Ына, дзейнага кіраўніка Паўночнай Карэі, не мае вызначаючага ўплыву на жыццё краіны.

Такім чынам, феномен культу асобы ўзнікае пры наяўнасці адной з пэўных прычын: таталітарны рэжым, які абапіраецца на сілавыя структуры, слабае развіццё свядомасці жыхароў, а таксама сервільнасць паплечнікаў правадыра. Да гэтага спісу можна дадаць і моцнае імкненне правадыроў замацаваць сваё імя ў гісторыі або забяспечаць асабістую недатыкальнасць. У сваю чаргу, культ асобы можа быць відавочным або вызначацца толькі з дапамогай аналізу палітычнай сітуацыі ў краіне.

***Кищук А. Ю.***

## ИСТОРИЯ БОРЬБЫ С ПРОСТИТУЦИЕЙ В РОССИИ

*Кищук Антон Юрьевич, студент 1 курса Белорусского государственного университета, г. Минск, Беларусь, lazycow345@gmail.com*

*Научный руководитель: канд. юрид. наук, доцент Сатолин В. Н.*

Во многих странах занятие проституцией вне закона и карается им. Однако некоторые европейские страны признают проституцию наравне с другими профессиями. В Германии и Нидерландах проститутки могут подать в суд на клиента и получать пенсию. В Финляндии данная работа не запрещена, но можно попасть в тюрьму за организацию борделей. В Великобритании действует уголовное наказание за секс с проституткой, которую заставляют насильно этим заниматься.